# ЛЁН, МАШЫНЫ, САБЕКОШТ

✦

**У. ЛАБАНОК**

**Першы сакратар Віцебскага абкома КПБ**

✦

Віцебшчына здаўна славіцца сваімі цудоўнымі ільнамі, высокімі ўраджаямі «паўночнага шоўку». На шырокіх прасторах калгасных і саўгасных палёў лён заваяваў трывалае месца. Пашыраючы пасевы гэтай культуры, павышаючы яе ўраджайнасць, працаўнікі сельскай гаспадаркі памнажаюць грамадскае багацце. У вобласці цяпер нямала калгасаў, у якіх ураджай ільнасемя і валакна складае па 5—6 цэнтнераў з гектара. Многія калгасы, атрымліваючы высокія даходы ад ільнаводства, сталі мільянерамі.

Нельга не сказаць і аб такой выдатнай з'яве, калі многія калгасы праз ільнаводства дабіліся рэзкага ўздыму ўсёй сваёй эканомікі. Даходы ад ільнаводства далі магчымасць калгасам значна папоўніць парк аўтамабілямі, трактарамі, сельскагаспадарчымі машынамі, узвесці сотні вытворчых і культурна-бытавых пабудоў, больш хуткімі тэмпамі вырашаць задачы электрыфікацыі і радыёфікацыі калгасаў.

Пярвічныя партыйныя арганізацыі, праўленні калгасаў, прапагандуючы дасягненні навукі і вопыт перадавікоў, выхоўваюць у працаўнікоў сельскай гаспадаркі любоўныя, клапатлівыя адносіны да ільнаводства.

У сацыялістычным спаборніцтве першынство займаюць ільнаводы Талачынскага раёна. Тут накоплен багаты вопыт. У мінулым годзе ў гэтым раёне было пасеяна 5.167 гектараў ільну, арганізаван старанны дагляд пасеваў, своечасова праведзена ўборка. Працаўнікі сельскай гаспадаркі раёна датэрмінова выканалі план здачы ільнасемя і трасты. За здадзеную прадукцыю атрымана звыш 28 мільёнаў рублёў.

норме 50. Падлікі паказваюць, што затраты працы ў параўнанні з ручным цераблennем зніжаны ў даным выпадку ў некалькі разоў. Калгас на гэтым сэканоміў звыш 13 тысяч рублёў, вызваліў 127 чалавек для іншых неадкладных работ у сваёй гаспадарцы.

Аб тым, які выдатны эканамічны эфект прыносіць механізаваная ўборка ільну, паказвае прыклад ільноцерабільшчыка калгаса «Дружба» Бешанковіцкага раёна тав. Дзяцела Рыгора Захаравіча. За адзінаццаць дзён гэты сапраўдны майстар сваёй справы ўбраў 138 гектараў—усю плошчу пасеваў ільну. На ўборку механізаваным спосабам затрачаны 22 чалавека-дні, а ручным спосабам трэба было б затраціць 1.380 чалавека-дзён. Калгас толькі на ўборцы сэканоміў каля 14 тысяч рублёў.

У мінулым годзе добра папрацавалі ільнаводы калгаса імя Леніна Лёзненскага раёна. На ўсёй плошчы (85 гектараў) сярэдняя ўраджайнасць ільнасемя і валакна склала 5,3 цэнтнера з гектара. Асабліва вызначылася паляводчая брыгада, якую ўзначальвае Герой Сацыялістычнай Працы Іван Арцёмавіч Глядчанка. Клапатлівымі рукамі ільнаводаў тут на 22 гектарах атрыман ураджай ільновалакна па 8 цэнтнераў з гектара.

У мінулым годзе хімічная прапалка ільну была праведзена на нязначнай плошчы—3.417 гектарах. Абком КПБ і аблвыканком паставілі задачу ў гэтым годзе больш шырока ўжыць яе і тым самым скараціць затраты ручной працы.

Але многія пытанні яшчэ не вырашаны. Сур'ёзным тормазам, напрыклад, з'яўляецца адсутнасць машын для комплекснай механізацыі ільнаводства. Асобныя аперацыі па вырошчванню ільну ўсё яшчэ выконваюцца ўручную. Гэта прыводзіць да таго, што не заўсёды своечасова ўдаецца справіцца з уборкай, ды і працоўныя затраты на вытворчасць адзінкі прадукцыі застаюцца вялікімі. У калгасах вобласці ёсць звыш 500 шыроказахопных ільноцерабілак. Безумоўна, іх выкарыстанне дае вялікі эканамічны эфект у параўнанні з ручным цераблennем. Але ж шыроказахопная ільноцерабілка не мае дасканалага снопавязальнага апарата. Як правіла, за машынай трэба ставіць некалькі чалавек, якія ўручную вязалі б снапы. Многа працы затрачваецца на сушку галовак ільну, затрымліваецца механізацыя такіх працаёмкіх працэсаў, як рассціланне ільносаломкі і падняцце трасты са сцелішчаў.

Адным з буйных недахопаў у рабоце па павышэнню якасці ільнопрадукцыі з'яўляецца недаацэнка сартавання трасты і валакна. У час абмалоту сартаванне па даўжыні і колеру саломкі робіцца не ва ўсіх калгасах. У выніку пры рассціланні і замочцы розная па якасці саломка змеш-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы